| фі-гу-ра | фі-ніш | фронт |
| фі-гу-рыст | фар-ту-шок | штраф |

## Памочнікі.



Вечарэе. Зараз прыйдуць
з работы тата і мама.
Тата — шафёр,
а мама працуе на ферме.
Федзя прынёс вады,
а Маня гатуе вячэру.
Малы Цішка
лушчыць фасолю.
Прыйшла мама.
Стамілася на ферме.
А тут і вячэра гатова.
— Малайцы,— кажа яна.—
А ты, Маня, і фартушок
назаўтра адпрасавала? —
здзівілася мама.
— А я фікус паліў,—
пахваліўся маленькі
Цішка.
Весела забрахаў
на двары Тайфун.
Гэта ідзе тата з работы.

### Прыказка.

Рукі малыя,
ды да працы ўдалыя.

| | | | |
|---|---|---|---|
| джа | джу | джы | джэ |

# Дж дж

Дж дж

| | | |
|---|---|---|
| джа-ла | у-ра-джай | джэм |
| ха-джу | са-джай | джэм-пер |
| са-джу | дож-джык | гля-джу |





## Дождж ык.

Кроплі светлыя звіняць,
скачуць па галінках.
І павіслі на траве
срэбнай павуцінкай.
Ліся, дождж ык,
градкі мый!
Ну яшчэ хоць трошкі!
Дождж ык, дождж ык залаты,
вадзяныя ножкі!



**Народныя прыкметы.**

Кветкі моцна пахнуць перад даждж ом.

Ластаўка лятае нізка — на дождж.

# У грыбы.



Пасля дажджу мы пайшлі ў грыбы.
Хораша ў лесе!
Хаджу, прыглядаюся.
Вунь у мох зашыліся махавікі.
А там пень абляпілі апенькі.
Мякка рэжа нож.
Іду глыбей у лес. Гляджу — грыб
на кусце. Гэта вавёрка сабе
на зіму прыпасы рыхтуе.
А вунь падасінавік.
Ён расце пад асінаю.
А пад-бя-ро-за-вік —
ля бярозы.
Баравікі любяць
хваёвыя дрэвы —
баравы лес.
Неўзабаве мы
назбіралі поўныя кашы.





# Воўк.

Хвошча, хвошча дождж.
Воўк схаваўся ў хвошч.
Хвост пад хвашчом,
а сам пад дажджом.

*Васіль Вітка*

| | | | |
|---|---|---|---|
| еў | е-хаў | п'ю | двор |
| з'еў | пад'-е-хаў | б'ю | на-двор'-е |

’

сям'-я
ве-ра-б'і

## Як хто спіць.

Кот-варко́т пад'есць, пап'е
малака і кла-дзец-ца спаць.
Падбярэ пад сябе лапкі,
за-плюш-чыць вочы — і мур-мур.





Сабака скруціцца ў клубочак,
схавае нос у поўсць і засне.
Здаецца, моцна спіць, а чуе,
калі хто чужы ў двор ступіць.

Многія птушкі спяць на дрэвах.
І ніякае надвор'е ім не страшна.
У іх цёплае пер'е.





Качкі, гусі могуць
спаць на вадзе.

А чайкі, калі спя-ша-юц-ца ў вырай,
спяць нават у палёце.



## Вожык.



— Вожык, ты чаму калючы?
Гэтак колешся балюча?
— Бо ваўкі, лісы, мядзведзі —
не найлепшыя суседзі!





## Нашы птушкі.

У нашым краі — Беларусі —
ёсць буслы, сарокі, гусі,
качкі, кнігаўкі, саколкі,
чаплі, совы, перапёлкі.
Каля рэчак, на лужайках,
ёсць глушцы, стрыжы і чайкі,
і вядуцца на балотах
жураўлі ў густых чаротах.
Пачнуць хорам — не здзівіцца,
ёсць дзе пець і весяліцца.

*А. Гурло.*

## Галубы.





Елі з рук яны каноплі,
крыллем лопалі, гулі
і дажджу буйныя кроплі,
быццам зерняты, дзяўблі.

*М. Лужанін.*

## Скорагаворкі.

Прыручыць сароку —
адна марока.
А сорак сарок —
сорак марок.

Бяжыць сцяжына
паміж ажыны.
І ўжо ў Жэні
ажыны ў жмені.

## Алфавіт.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Аа | Бб | Вв | Гг | Дд |
| (Дждж | | Дздз) | Ее | Ёё |
| Жж | Зз | Іі | й | Кк |
| Лл | Мм | Нн | Оо | Пп |
| Рр | Сс | Тт | Уу | ў |
| Фф | Хх | Цц | Чч | Шш |
| ь | ы | Ээ | Юю | Яя |

# Мінск.

Мінск — самы вялікі горад Беларусі. Гэта наша сталіца.

Тут шмат заводаў і фабрык.

У Мінску многа школ.

У Мінску выдаецца шмат газет і часопісаў. У Мінску надрукаваны ваш «Буквар».

Вуліцы Мінска шырокія, прасторныя, дамы шматпавярховыя. Па вуліцах ходзяць тралейбусы, трамваі, аўтобусы, аўтамабілі.

А не так даўно тут пабудавалі падземную чыгунку — метро.

Мінск — горад-герой.





Пачынае ледзь світаць —
мчыць тралейбус працаваць.
За драты ён ухапіўся,
па асфальце пакаціўся.






Ваду возіць вадавоз.
А бензін — бензавоз.
Што ж вязе малакавоз?







Свіснуў раз, свіснуў два
шустры паравозік.
І павёз, і павёз
за возікам возік.

*Янка Купала.*






## Хлопчык і лётчык.

— Мой мілы таварыш, мой лётчык,
вазьмі ты з сабою мяне!
Я — ведай — вялікі ўжо хлопчык
і ўмею ўжо лётаць у сне.

Мне ўжо надакучыла дома —
у дзіцячы хадзі адно сад,
а так паглядзеў бы, вядома,
на іншы парадак і лад.

Вазьмі ж мяне, лётчык, хачу я
пабыць у людзях, паглядзець,
як месяц на небе начуе,
як блукае ў лесе мядзведзь,

як свецяцца ночкаю зоры,
а днём не відаць іх чаму,
як рэчкі ў далёкія моры
ўлетку плывуць і ўзіму.

*Янка Купала.*

---

1. Аб чым хлопчык просіць лётчыка?
2. Чаму хлопчыку хочацца паляцець на самалёце?



Вы ўжо чыталі верш «Хлопчык і лётчык». Яго вельмі любіў маленькі Юрый Гагарын. Верш напісаў Янка Купала.

Янка Купала і Якуб Колас — выдатныя народныя паэты.

Яшчэ з дзяцінства палюбілі яны прыроду роднай Беларусі, нашы песні, казкі, беларускую мову.

Сёння іх кнігі вядомы ва ўсім свеце. Яны вучаць нас любіць Радзіму.

Янка Купала і Якуб Колас напісалі для вас шмат казак, вершаў.

## Каток.

У Савосева суседа
быў пярэсценькі каток,
выхаванец Паўла-дзеда,
такі слаўны пестунок!
Нос чарнявы,
хвост бялявы,
задзірасценькі;
кіпцік-шчыпчык
заграбасценькі;
лапкі-драпкі
машастовыя,
а шарсціначкі
шаўковыя;
губкі, зубкі
адмысловыя;
вусы русы
патырчастыя;
тая спінка,
як націнка,
выгінастая.
Вушкі-слушкі
не мыляюцца,
вочкі ўночку
запаляюцца.



Хадзіў коцік пад масток,
лавіў рыбку за хвасток,
потым дзеду ён на печы
казкі-байкі варкаваў,
белым хвосцікам дарэчы
тахты спевам адбіваў.

*Якуб Колас.*

# Шукаем вясну.

Яшчэ снег ляжыць на полі. А неба стала высокае, яснае. Наш клас шукае ўжо вясну.

Кожны з нас стараецца знайсці нейкія прыкметы блізкай вясны.

Ніна знайшла прыкметы вясны ў магазіне «Агароднiна».

А Паўлік шукаў вясну ў парку. На вярбе ён заўважыў коцікі.

Міша быў на лясной паляне і ўбачыў блакітныя пралескі.

Сёння мы зрабілі малюнкі, з якіх відаць, што ідзе вясна.

Тры найлепшыя з іх выбралі.

Вось яны, вясёлыя, вясновыя.







1. Дай назвы малюнкам.
2. Хто які малюнак намаляваў?



## Песня аб вясне.

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках — булі-гулі! —
Песні чуюцца вясне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,
гэты жэўжык-ручаёк.
На яго, бы тая матка,
сонца кідае свой зрок.

А зіма аж пачарнела —
годзе ёй тут кросны ткаць!..
Гэй, маленства, жыва, смела
выйдзем весну прывітаць!

*Якуб Колас.*



---

1. Якія прыкметы вясны называюцца ў вершы?

2. Як ты разумееш радок верша: «А зіма аж пачарнела»?




1. Разгледзь малюнак і адкажы на пытанні:
   Ці ведаеш, якая гэта дата 8 Сакавіка?
   Якія кветкі ты бачыш на малюнку?
2. Чым ты парадуеш маму на свята?

# Матуліны рукі.

Матуліны рукі
нас песцяць, галубяць,
так шчыра, як маці,
ніхто нас не любіць.

Матуліны рукі —
адзіныя ў свеце.
Шануйце, любіце
заўсёды іх, дзеці.

*Вера Вярба.*





## Дзесяць памагатых.

У Ніны ў хаце заўсёды чыста. Яна і ўрокі зробіць, і малога браціка пазабаўляе, і маме на кухні паможа. На ўсё ў яе часу стае.

— Як ты паспяваеш усё рабіць? — пытаецца ў яе сяброўка Воля.

— А ў мяне дзесяць памагатых. Яны мне і робяць усё.

— Дзе ж гэтыя твае памагатыя?

— Ды вось яны,— усміхнулася Ніна і паказала на свае дзесяць пальцаў.

---

1. Прачытай, што робіць дома Ніна.
2. Хто ёй дапамагае?
3. Як ты дапамагаеш сваім бацькам дома?

# Агарод.



Выцірала бабка пот,
даглядала агарод:
і фасольку-спавітушку,
і пятрушку, і чарнушку,
рэпку, рэдзьку, буракі,
мак, салату, агуркі,
і капусту, і ўкроп,
часначок, цыбулю, боб,
гарбузы і памідоры.
У старой работы — горы.
Працаваць адной дакука —
кліча бабка ўнучку, унука —
і палоць, і палівацъ,
прарываць і аграбаць.
Вось унукі, дык унукі;
да работы — на ўсе рукі.

*С. Шушкевіч.*



---

1. Да якой работы запрашала бабка сваіх унукаў? Прачытай.

2. Як ты памагаеш дарослым у іх працы?

## Прыказка.

Што аднаму цяжка, тое гуртам лёгка.

## Усе для ўсіх.





Муляр гмахі муруе,
а кравец шые ўбранне.
Але дзе б працаваў ён,
каб не меў памяшкання?

Каб мець пекару боты —
да шаўца яму трэба.
А калі б не той пекар,
дык шаўцу быць без хлеба.

Для супольнай карысці,
не шкадуючы сілы,
трэба ўсім і заўсёды
працаваць, дружа мілы.

*Ю. Тувім.*

## Як птушкі вучыліся будаваць гнёзды.

**(Казка.)**

Аднаго разу жар-птушка паклікала крылатых, каб навучыць іх будаваць гнёзды.

— Кожная птушка павінна мець гняздо. Але навучыцца будаваць яго — нялёгка,— сказала яна.— На гэта трэба шмат цярплівасці. А то нічога не выйдзе.

Не паспела яна дагаварыць, як курыца пачала дзяўбці носам і тут жа заснула.

Жар-птушка між тым казала далей:



— Перш чым будаваць гняздо, трэба падумаць, дзе яго будаваць. Лепш за ўсё выбраць на дрэве галіну з трыма развілкамі. Пасля трэба назбіраць дубчыкаў. І, памагаючы сабе дзюбаю і лапамі, сагнуць іх. Пакласці адзін на адзін...

Даслухаўшы да гэтага месца, варона каркнула:

— Кар-кар! Калі трэба толькі моцная дзюба ды лапы, дык буду мець добрае гняздо. Больш мне і ведаць нічога не трэба.

І варона адляцела.

Жар-птушка тлумачыла далей:

— Але яшчэ лепш гняздо звіць пад страхою, дзе не будуць страшныя ні дождж, ні снег...

Верабей падскочыў:

— Вось і добра! Палячу хутчэй, пакуль іншыя птушкі не занялі ўсе лепшыя месцы.

Яму даўно ўжо не сядзелася тут, і ён адляцеў.

Але жар-птушка яшчэ не скончыла.



— Калі месца выбрана і дубчыкі звітыя, трэба прынесці ў дзюбе гліны і як след замазаць усе шчыліны. Потым пасланнь усярэдзіне сухой травы і мяккага пуху. Вось тады і будзе цудоўнае жыллё.

Жар-птушка змоўкла. Маленькая ластаўка, якая даслухала яе да канца, падзякавала ёй і паляцела. Паляцела і жар-птушка.



А курыца ўсё спала і нічога не чула. Так і дагэтуль яна не ўмее віць гнязда. І жыве курыца ў куратніку, які заўсёды будуюць для яе людзі.

Варона ўе сабе гняздо. Але якое гэта гняздо! Тоўстыя дубцы тырчаць з яго ва ўсе бакі, вецер прадзімае наскрозь яго. Дождж палівае зверху.

Верабей жыве ў шчылінах пад стрэхамі дамоў.

Толькі адна ластаўка ўмее віць сапраўднае гняздо. Бо яна ж уважліва і цярпліва выслухала ўсё, што казала жар-птушка. Гняздо ластаўкі знадворку аблеплена глінаю, усярэдзіне выслана сухою травой і мяккім пухам. Ёй не страшны ні дождж, ні вецер. І птушаняткам яе заўсёды цёпла і ўтульна.





---

1. Чаму ў птушак, паводле казкі, розныя гнёзды?
2. Хто быў няўважлівы на птушыным уроку?
3. Чаму ластаўка змагла зрабіць найлепшае гняздо?



## У госці.

Кліча пеўня ў лес ліса:
— Маю градку я аўса.
Спее на другой пшаніца —
ёсць чым, Пеця, падкарміцца.

— Лес мне, ліска, не патрэбен —
абдзяру аб голле грэбень,
абскубу прыгожы хвосцік,—
запрасі ты Жучку ў госці.

*Н. Галіноўская.*



1. Што прапанавала ліса пеўню?
2. Чаму певень адмовіўся ісці ў госці?
Як вы думаеце?

## Жук і слімак.

Пагожым летнім ранкам
на лузе за сялом
сустрэўся жук аднойчы
з рагатым слімаком.

— Здарова! — жук вітае.—
Куды, браток, ідзеш
і з ракавіны хатку
нашто з сабой нясеш?

Абцёр слімак пот з твару,
гаворыць так жуку:
— Нямала паражыць мне
прыйшлося на вяку.

То сцюжа, то марозы,
то навальніца, дождж.
То, часам, у дарозе
захопіць змрок і ноч,—

шукай тады начлегу
пад нейкім пад кустом...
Гавораць яны гэтак
і раптам чуюць — гром.

Ударыў дождж краплісты.
І жук пабег шукаць
дзе ў засені цяністай
шырокага лістка.





Але на цэлым лузе
няма страхі нідзе,
і мокры, ледзь жывы ён
да слімака ідзе.

— Пусці, браток, пагрэцца,
змок дужа на лугу,
насіць за гэта хатку
табе дапамагу.

У ракавіне шчыльнай
вандроўнікі сядзяць.
І нават дождж краплісты
не зможа іх дастаць.

Але мінулі хмары,
і сонца ўстала зноў,
жук хату слімакову
пакінуў і пайшоў.

Забыўся пра нягоды
і не наўме жуку,
што абяцаў паднесці
ён хату слімаку.

*Максім Танк.*

1. Знайдзі радкі, дзе жук просіць слімака пусціць яго ў хатку. Прачытай гэтыя словы так, каб слімак абавязкова паслухаўся.

2. Што абяцаў жук слімаку? Ці выканаў ён сваё абяцанне? Як ты прачытаеш апошнія радкі — ці з абурэннем, ці абыякава, ці са шкадаваннем?

# Спрэчка.

Жылі на адным двары кот ды певень, сабака ды казёл. Увечары, бывала, збяруцца ўсе яны каля ганка і гавораць пра рознае. У адным ніяк не маглі яны дамовіцца: што найсмачнейшае?

— Няма нічога лепш за малачко,— кажа кот Максім, прысаджваючыся пад цадзілкаю, што сушылася на плоце.— Добра таксама і мышкаю паласавацца, але злавіць яе — вялікі клопат.

— Што малачко! Вось каб авёс ці крупы, гэта куды лепш,— кажа певень.

— А як добра свежанькага сенца пажаваць, асабліва калі духмянае,— прамовіў казёл.

— Ды што вы, браткі, кажаце,— перапыніў іх Лыска.— Калі што сапраўды добрае, дык гэта костачка. Колькі я на сваім вяку з'еў касцей! Я дык ужо разбіраюся ў ядзе!..



Спрачаліся яны, спрачаліся, а што лепш, і цяпер да згоды не прыйшлі.

---

1. Што здаецца найсмачнейшым кату?
2. А што найбольш любяць певень, казёл?
3. На што ласы сабака?
4. Чаму не прыйшлі да згоды між сабою кот, певень, сабака і казёл?



## Апельсін і яблык.

Абабрала Алеся лушпінне з апельсіна і здзівілася:

— Апельсін, чаму ты ўвесь з долек?

— А гэта дзеля таго, каб ты ўсіх магла пачаставаць,— адказаў ёй апельсін.

— А ты, яблык, чаму не маеш долек? Відаць, каб я цалкам цябе магла з'есці? — спытала Алеся, узяўшы ў рукі яблык.

— Не,— адказаў яблык,— каб ты мяне ўвесь аддала сваёй сяброўцы.

# Зайчыкаў хлеб.



Жыве ў цёмным лесе
спагадлівы зайчык,
каго ні сустрэне,
дасць хлеба акрайчык.



Спаткае дзядулю —
падорыць ласункі
і ўнучцы з унукам
пашле падарункі.

З поля вяртаюцца
тата і мама
і зайчыкаў хлеб
нам прыносяць таксама.

*П. Граніт.*

---

Пра які зайчыкаў хлеб гаворыцца ў вершы?



Якія тут пераблытаны казкі? Раскажы іх.

# Добрыя словы.





Паглядзі на малюнкі і адкажы: на якім Галя павінна сказаць «прабачце», на якім — «калі ласка», а на якім — «дзякуй»?

Што павінен зрабіць Сцёпа?



## Калі мы так гаворым?



Добры дзень!
Добры вечар!

Просім!
Дзякуй!

Смачна снедаць!
Смачна абедаць!
Смачна вячэраць!
Смачна есці!

Бывайце здаровы!

«Дабранач» — кажу ўсім нанач.

## Верабейчык.



Верабейчык: ціў, ціў, ціў,
колас дзюбкаю ўхапіў,
а таму што ён быў добры —
па зярнятку ўсім дзяліў.
Елі зерні ўсе са смакам,
шчабяталі: дзякуй, дзякуй!

**Прыказка.**

Любіць увесь свет лагодны прывет.

# У лесе.

Мохам, ядлоўцам і смолкай
пахне ад цёплай зямлі,
колюць зялёныя голкі,
лётаюць важна чмялі.

Колькі б вы казак ні чулі,
колькі б ні зналі забаў —
лепшыя казкі і гульні —
у лесе, між елак і траў.

*Вера Вярба.*



# У лясах Белавежы.

Белавежская пушча... Адзін з самых вялікіх лясоў на свеце.

Ідзеш па пушчы і — не адарваць вачэй ад лясной красы. Дуб, ясень, граб, хвоя, бяроза, клён, асіна, елка, чорная вольха... Пушча ўсё новая і новая.

Галоўны яе звер — зубр. Вялізны. На выгляд можа здацца нязграбаю і марудаю. А між тым умее хутка бегчы і раптоўна спыняцца.

Дзе пройдуць яго рогі між дрэў, пройдзе і сам зубр.

Гэты лясны велікан умее прабірацца праз топкае балота. Зубровыя сляды не раз праводзілі ў вайну партызан праз багну.

Зубр ніколі не нападае першы. Але калі яго раззлаваць, то цяжка стрымаць. Бо зубр — самая дужая, самая магутная ў нас жывёліна. Тоўстае бервяно ён лёгка падкідае рагамі.

Нездарма зубр — на радыятары беларускіх аўтамабіляў. Гэта знак дужасці і сілы нашых машын.



## І малое не ў крыўдзе.

У маленькага аленіка — плямістая шкурка. Гэта нібы яркія промні сонца, што прабіліся праз лістоту. Такая шкурка добра хавае яго ад злога вока рысі ці забеглага ваўка.

Бо маці-аленіха не зможа ў бядзе ўратаваць ад драпежніка сваё дзіця. Яе самую ратуюць толькі ногі.

Але ў аленіка ёсць у Белавежскай пушчы надзейныя абаронцы — зубры. І аленік спяшаецца прыстаць да зубровага статка. Зубры самі не пакрыўдзяць малечу і другому каму таксама не дадуць у крыўду.



## Кватэры — сябрам.

А што гэта? Пад дубам шышкі? Адкуль яны тут узяліся?

У расколіне між кары дуба дзяцел зрабіў «кузню». Заклініў там яловую шышку і носам тук-тук. Дастане семкі, а шышку спіхне ўніз. І зноў ляціць на яліну па новую шышку.

А там вось яшчэ адзін дзяцел.

— Стук-стук,— аж разлягаецца ў пушчы яго моцны пошчак. Падзёўб, падзёўб ён і



хутка перабег на другі бок. Нібы ўпэўніцца хоча: ці не прадзёўб навылет дрэва?

Не. Дзяцел ведае: ад моцнага стуку звычайна выпаўзаюць з кары патрывожаныя розныя жучкі, чарвячкі, караеды.

Тут і будзе яму спажытак.

Дзяцел — карысная птушка. І не толькі таму, што знішчае шкоднікаў дрэў.

За сваё жыццё ён нарабіў шмат хатак розным птушкам. Сінічкі, шпакі, сычы, мухалоўкі жывуць у яго дуплах.

Штогод дзяцел дзяўбе сабе новае дупло, а старое пакідае іншым.

## Добры зайцавы звычай.

У зайчыхі вывеліся першыя зайчаняты. Вунь яны — белыя клубочкі — сядзяць пад кустом. Здалёку нібы гурбачкі снегу, што яшчэ не ўсюды растаў, хоць ужо і вясна. Затаіліся зайчаняткі. І дрыжаць — ад холаду і голаду.

Дзе цяпер іх мама? Можа, ужо далёка-далёка адсюль, у другім канцы пушчы. Можа, яе высачыў звер ці напалохала якая птушка. Хіба мала ворагаў у зайцаў?

Адзін паратунак малых — добры зайцавы звычай. Якая б зайчыха ні бегла тут, спыніцца і

напоіць іх цёплым тлустым малачком.

Бо, можа, і яе дзетак у гэты час на другім канцы пушчы корміць іншая зайчыха-маці.



Нап'юцца малечы і тры дні пасля могуць зноў ціха сядзець, каб не згледзела іх сава ці ястраб.

Міне тыдзень-другі, і як даспадобы прыйдуцца ім зялёная салатка травы і скарыначка шурпатай кары.

## Жывы клубок воўны.

Вунь галка ўляпілася дзюбаю за тонкую галінку таполі і павісла. Крохкая галінка хруснула і абламалася. Галка тут жа панесла яе на гняздо.

Але што за гняздо з цвёрдых галінак? Вось бы разжыцца на мяккую поўсць, каб выслаць гняздо.



Бачыце? Шпак гоніцца за вавёркаю — гэтым жывым клубком воўны. Імгненне — і поўная дзюба поўсці!

Мякка будзе маленькім шпачкам...

Некаторыя звяркі зусім не ўцякаюць ад птушак. Увесну яны ліняюць, і ім прыемна, калі тыя скубуць з іх поўсць.

## Запаведнік.

Цяпер Белавежская пушча — запаведнік.

Секчы дрэвы, паляваць на дзічыну тут няможна. Усякі звер, усякая птушка тут пад аховаю чалавека. Толькі ваўкам — гэтым лясным разбойнікам — уваход сюды забаронены.

Вось венікі, але не для падлогі.

Узімку яны — найлепшы корм зубрам, аленям, казулям.



Цяжка прыйшлося б вялікаму пушчанскаму жывёльнаму статку, калі б не ўвага чалавека.

Дзікі, як вядома, найбольш любяць бульбу. Тут для іх параскіданы бульба, буракі, морква.

У шмат якіх мясцінах пушчы знарок для звярыны зроблены вадапоі, пакладзена соль.

Палізаць саланец прыйшла казуля.

---

1. Як дапамагаюць адзін аднаму насельнікі пушчы? Прыгадай добрае суседства аленіка і зуброў, шпака і вавёркі, дзятла і іншых птушак.

2. Як дапамагае чалавек звярам?

# Музы́кі.

Вось прыйшлі музыкі
чарадой вялікай.
Граў на скрыпачцы камар,
на дудачцы — чмель-дудар.
Муха на цымбалах
струны калыхала,
авадзень на леры
выцінаў без меры,
а чырвоны конік
жарыў у гармонік.

Якуб Колас.



1. Хто іграў на скрыпцы, хто — на дудцы і хто — на цымбалах?

2. Што атрымалася, калі б яны памянялі свае музычныя інструменты?



## Вуж.

Вуж
паўзе
сабе
дарожкай,
не кране
ніводнай
ножкай.



Ён
пакратаў бы,
каб мог,
але
вуж
не мае
ног.

*Максім Лужанін.*

---

Як ты думаеш, чаму ў гэтым жартоўным вершы так размешчаны словы?





## Загадкі.

Хто паўзе вось тут у парку,
а свой дом нясе на карку?

Хто ў чырвоных ботах
ходзіць па балотах?

**Рабі гэта сам і пакажы сваім сябрам.**



Рана ўстаўшы, мы спачатку
дружна робім фіззарадку...

# Дзве кроплі.



Аднаго разу сустрэліся дзве вадзяныя кроплі. Адна з-пад крана, другая з лужыны.

— Добры дзень! — прывіталіся яны і пераглянуліся.

— Як мы падобныя адна на адну. Ну як дзве кроплі.

— Пачакайце! — сказаў доктар.— Гэта не так. І пагледзеў на іх праз павелічальнае шкло. Кропля з-пад крана была чыстая і празрыстая. Такую ваду можна піць. Яна — як з крыніцы. У крыніцы вада чыстая. Кропля з лужыны была мутная.

Вось што ўбачыў доктар.

Там плавалі, кішэлі розныя жывучкі.

Ад іх можна захварэць.

А таму няможна піць вады з возера, рэчкі, лужыны.

П'юць ваду толькі з вадаправода, крыніцы, калодзежа.

---

1. Чаму няможна піць вады з возера, рэчкі, лужыны?
2. Як ты выконваеш правілы гігіены?



# Май.

Я сцяжок свой узнімаю
проста ў сонечны прамень.
Сёння — свята Першамая,
сёння — мая першы дзень!

У калоне
песню ўголас
з намі разам запявай!
І прыгожы, і вясёлы
мой любімы
месяц май.

Адышлі даўно трывогі.
І ўрачыста
кожны год
Дзень Вялікай Перамогі
адзначае наш народ.

Чуеш выбухі салюта?
Палічыць іх паспявай.
Перамогаю
славуты
мой любімы
месяц май.

*А. Вольскі.*

## Бамба.

Ён чарнаскуры,
з Афрыкі родам.
Бамба маленькі —
наш аднагодак.
Хлопчык карпее
з самага ранку
над негрыцянскай
першай «Чытанкай».
Бамба са школы
прыйдзе дадому —
скача, дурэе.
Дзе тая стома?
Кажа матуля:
— Сціхні ты, любы! —
Ён надзімае
тоўстыя губы.
Маці гаворыць:
— Пара табе мыцца! —
Бамба баіцца
белым зрабіцца.
Шкода, што Бамба,
чорны, вясёлы,
з намі не ходзіць
разам да школы.

*Ю. Тувім.*




Паглядзі на малюнак і адкажы, да якіх радкоў ён адносіцца.

## Прыказка.

Нашы сябры — па ўсёй зямлі.

# Як прыйшла да нас кніга.

## Буквар на гліняных таблічках.

Ты, можа, думаеш, што кнігі былі заўсёды. А між тым быў час, калі ні кніг, ні паперы не было.

На чым толькі не пісалі тады людзі! На лісцях дрэў, на бярозавай кары...

А ў далёкім краі — Афрыцы — была такая расліна папірус. Падобная да нашага аеру ці трыснягу. Людзі разразалі яе сцябло на палоскі, склейвалі і на іх пісалі. Ад папіруса пайшла і назва нашай паперы.

А яшчэ даўней пісалі на гліняных таблічках. Размочвалі гліну і палачкаю рабілі на ёй знакі. Цікавая «папера» — ці не праўда? Нават у агні не гарыць.

Але калі б твой «Буквар» быў напісаны на такіх гліняных таблічках, дык ты б не падняў яго. Такі цяжкі быў бы ён. Ды і конь не пацягнуў бы воз з такім букваром. Вунь, бачыш, стаіць аднатонка? Хіба дзесяць такіх машын змаглі б толькі павезці тваю кнігу. Вось і ўяві: ідзеш ты ў школу, а дзесяць машын вязуць за табою твой «Буквар».



Смешна! Нязручная такая кніга.

Таму людзі ўвесь час шукалі, на чым жа было б лепш пісаць. Гліняныя таблічкі цяжкія, папірус рос далёка. Не заўсёды яго прывязеш.

## Кнігі на ланцугу.

Пазней пачалі пісаць на скурах маленькіх цялят, ягнят, казлянят. Ачышчалі скуры ад поўсці і пісалі.

На тоўстую кнігу ішло каля двухсот скурак. Падумай толькі — цэлы калгасны статак на адну кнігу! Таму даўней кніга была вельмі дарагая. Нават не ўсякі багаты чалавек мог купіць яе.

Ды і перапісвалі кнігі ад рукі. Каб выразна перапісаць адну кнігу, трэба было затраціць цэлы год.

І не дзіва, што ў даўнія часы кнігі ў бібліятэках былі акаваныя і нават навязаныя на ланцугу.

Іх можна было там пачытаць на стале, але не можна было ўзяць дадому.



---

1. На чым даўней пісалі людзі?
2. Адкуль пайшло слова папера?
3. Чаму кнігі былі вельмі цяжкімі?

## Наш першадрукар.

Мінула яшчэ шмат часу, пакуль пачалі ў нас пісаць на паперы. Яе выраблялі з перамолатага старога адзення ці дрэва.

Папера была куды таннейшая за скуры.

А яшчэ далей дадумаліся людзі не перапісваць, а друкаваць, адбіваць кнігі.

Усе вы, пэўна, бачылі пячатку ці штэмпель. Там выразаны словы ці малюнак. Змазаў такую пячатку ці штэмпель чарнілам ці тушшу і адбівай. Адразу гатовы надпіс ці малюнак.

Так і пачалі вырэзваць на дошчачках старонкі і адбіваць іх на паперы. Пасля аркушы з адбітым пісьмом сшывалі, перапляталі, рабілі вокладкі, і выходзіла кніга.

Вырэзваць старонкі было марудна, але затое адбіваць пасля было ўжо лёгка.

Пазней пачалі вырэзваць не старонкі, а толькі літары.





І ўжо з літар, як вы з разразной азбукі, набіраць словы, сказы.

Раней дошчачкі-старонкі пасля друку даводзілася выкідаць. Яны ж былі ўжо зусім непатрэбныя. А новыя старонкі трэба было зноў вырэзваць.

А калі пачалі вырэзваць літары, то з тых самых літар можна было набіраць усё новыя і новыя словы, старонкі.



Першым чалавекам, які пачаў друкаваць кнігі на нашых землях, быў беларус Францыск Скарына.

Ён нарадзіўся ў горадзе Полацку. Гэта было даўно — 500 гадоў таму назад. Але і цяпер памятаюць пра яго. Яго імем названы вуліцы, плошчы.

А вось які цудоўны помнік узведзены яму ў яго родным Полацку.

---

1. Як раней рабілі кнігі?
2. Хто першым пачаў друкаваць кнігі ў нашым краі?

# Свята.

— Сёння ў нас свята,— сказала настаўніца.

— Якое ж свята,— падумала Вераніка,— сёння будны дзень.

— Калі свята, дык чаму ж мы вучымся? — спытала Алеся.

— Дзеці, вось мы і прачыталі буквар. Ён навучыў нас чытаць і пісаць. Вы ўжо можаце самі пісаць пісьмы, чытаць часопісы «Вясёлка», «Бярозка», газету «Піянер Беларусі». У вас цяпер стане многа-многа сяброў. Бо кнігі — самыя лепшыя сябры. І яны раскажуць вам шмат цікавых казак, вершаў. А ўсе кнігі вы ўжо можаце прачытаць.

Дык хіба гэта не свята?





## Просьба кніжкі.

Абгарні мяне ў паперу.
Не бяры мяне нямытымі рукамі.
Не чытай мяне, калі ясі.
Не пішы і не малюй на маіх старонках.
Не загінай ражкоў, зрабі закладку.
Не кладзі ў мяне аловак ці ручку.
Не вырывай маіх старонак.



Учебное издание

**Клышка** Анатолий Константинович

**БУКВАРЬ**

Минск, издательство «Народная асвета»

На белорусском языке

Вучэбнае выданне

**Клышка** Анатоль Канстанцінавіч

**БУКВАР**

Загадчык рэдакцыі А. А. Дзераш
Рэдактар Н. Ф. Лапіцкая
Мал. рэдактар А. М. Лапкоўская
Кіраўнік групы мастакоў Р. С. Фралоў
Макет і шрыфтавое афармленне І. І. Бокія
Пераплёт І. А. Дзямкоўскага
Мастакі-ілюстратары: А. А. Лапіцкая, Я. І. Жылін,
Г. Я. Скамарохаў, У. А. Малахаў, А. С. Грубіна,
М. Д. Рыжы, В. І. Валынец, В. С. Сідарава,
А. Б. Грубіна, В. М. Бароўка, К. П. Шаранговіч,
У. М. Жук, І. А. Дзямкоўскі, М. І. Байрачны,
В. Ф. Александровіч, Р. С. Фралоў,
А. В. Александровіч, А. А. Крохіна, Т. А. Мельянец,
У. І. Сытчанка, Л. А. Зярніцкі
Тэхнічны рэдактар А. У. Івашка
Карэктар С. Т. Асташэвіч

ИБ № 3392

Дадатак: разразныя азбука і склады, разразны матэрыял.

Падпісана ў друк з дыяпазітываў 02.10.92. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Гарнітура журнальная, рубленая. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 10,53+0,29 форзац + 0,74 укл. (разразныя азбука і склады) + 1,17 укл. (разразны матэрыял). Умоўн. фарба-адбіт. Ул.-выд. арк. 13+0,48 форзац + 0,5 укл. (разразныя азбука і склады) + +1,05 укл. (разразны матэрыял). Дад. тыраж 145 000 экз. Заказ 371. Цана 255 руб.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Надрукавана на фабрыцы каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20. Дыяпазітывы МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

| | |
|---|---|
| А | Я |
| У | Ю |
| О | Ё |
| Э | Е |
| ы | І |

*Аа Бб Вв Гг Дд*

*Дждж Дздз Ее Ёё*

*Жж Зз Іі й Кк Лл*

*Мм Нн Оо Пп Рр*

*Сс Тт Уу ў Фф Хх*

*Цц Чч Шш ы ь Ээ*

*Юю Яя*

| | | |
|---|---|---|
| Б | Й | Т |
| В | К | Ў |
| Г | Л | Ф |
| Д | М | Х |
| Дж | Н | Ц |
| Дз | П | Ч |
| Ж | Р | Ш |
| З | С | |

255 p.

А. К. КЛЫШКА ❋ БУКВАР (1993)